Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

УДК (811.161.3 + 811.163.2)' 373

АБ ПОЛІСЕМІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ЛЕКСІКІ БЕЛАРУСКАЙ І БАЛГАРСКАЙ МОЎ У СФЕРЫ ФІКСАЦЫІ (кантрастыўны аспект)

Д.А. Карпечкіна (кафедра агульнага і славянскага мовазнаўства)

Пытанні функцыянавання роднасных моў у супастаўляльным аспекце здаўна прыцягвалі ўвагу лінгвістаў, паколькі дазвалялі выявіць спецыфічныя адзнакі кожнай з іх, якія, як вядома, «найбольш відавочна выяўляюцца на фоне падобных» [2, с. 23]. У апошні час у сувязі з пануючым у нашай шматнацыянальнай краіне дзяржаўным білінгвізмам беларускае мовазнаўства ўзбагацілася значнай колькасцю даследаванняў, зарыентаваных на супастаўленне моўных асаблівасцяў беларускай і рускай моў. Не менш актуальным нам уяўляецца далейшае вывучэнне ўзаемасувязяў беларускай мовы з іншымі славянскімі мовамі па прычыне пашырэння моўных кантактаў. Спынімся на

некаторых момантах функцыянавання полісемічных намінацый у сельскагаспадарчай лексіцы беларускай і балгарскай моў.

У многіх працах па тэрміналогіі полісемія спецыяльных найменняў разглядаецца як адзін з іх самых істотных недахопаў, паколькі толькі пры ўмове адназначнасці тэрмін можа выконваць свае функцыі ў сферы спецыяльнай камунікацыі. У сувязі з гэтым некаторыя лінгвісты настойваюць на поўнай ліквідацыі полісеміі ў мове навукі, «незалежна ад ступені шкоднасці» [1, с. 20]. Стваральнікі новых тэрмінаў і ўкладальнікі тэрміналагічных і перакладных слоўнікаў імкнуцца па магчымасці стрымліваць развіццё полісеміі, і тым не менш, як адзначаюць даследчыкі, мнагазначнасць у большай ці меншай ступені ўласціва многім галіновым тэрмінасістэмам славянскіх моў. Разгледзім некаторыя прыватныя выпадкі існавання полісеміі ў сельскагаспадарчай лексіцы беларускай і балгарскай моў, што будзе садзейнічаць больш глыбокаму і аб'ектыўнаму разуменню з'явы ў кожнай з гэтых лінгвістычных сістэм.

Аналіз фактычнага матэрыялу сферы фіксацыі паказаў, што полінайменнасць беларускіх тэрмінаў сельскагаспадарчай галіны ў многіх выпадках узнікае за кошт т. зв. катэгарыяльнай мнагазначнасці, калі адно найменне можа выкарыстоўвацца для называння паняццяў розных катэгорый, напрыклад, дзеяння і яго выніку: *памол* – 1. Раздрабненне, ператварэнне зерня ў муку. 2. Змолатае збожжа; мліва. Праўда, як відаць з прыведзенага слоўнікавага артыкула, для называння выніку дзеяння прапануецца ўжываць і найменне *мліва.* У балгарскай мове ў гэтым выпадку для называння дзеяння выкарыстоўваецца намінацыя *смилане,* а для абазначэння яго выніку – словазлучэнне *смляно брашно* і, такім чынам, полісемія не развіваецца.

У беларускай сельскагаспадарчай тэрміналогіі грашаць мнагазначнасцю ў асноўным аддзеяслоўныя назоўнікі, што азначаюць працэс, дзеянне і адначасова развіваюць у сабе прадметныя значэнні, якія лагічна вынікаюць са значэння працэсу: *пасеў* – 1. Дзеянне паводле знач. дзеясл. *пасеяць.* 2. Тое, *што пасеяна; угнаенне* – 1. Дзеянне паводле знач. дзеясл. угнойваць – *угнаіць.* 2. Рэчыва, якое ўносіцца ў глебу для павелічэння ўраджаю. У балгарскай мове ў такіх выпадках мнагазначнасць не ўзнікае, паколькі аўтары слоўнікаў імкнуцца размежаваць значэнні падобных намінацый. Для абазначэння пасеву як працэсу тут ужываюцца намінацыі *сеене, засяване, сеитба,* калі ж неабходна назваць вынік дзеяння, ужываецца назва *посев.* Такое дзеянне, як *угнаенне* абазначаецца сінанімічнымі лексемамі *торене, наторяване*, для называння ж рэчыва, якое ўносіцца ў глебу, выкарыстоўваецца намінацыя *тор.* Але і канкурэнцыя некалькіх адпаведнікаў (сінонімаў) для называння аднаго і таго самага паняцця – непажаданая ў тэрміналогіі з'ява, нягледзячы на тое, што многія даследчыкі дапускаюць існаванне паралельных найменняў для аднаго аб'екта, а часам нават даказваюць неабходнасць існавання сінонімаў у мове навукі, падкрэсліваючы, што сінанімія – адна з важных праяў сістэмных адносін у тэрміналогіі.

Мнагазначнасць некаторых сельскагаспадарчых намінацый можа быць выяўлена пры іх супастаўленні з найменнямі іншых галіновых тэрмінасістэм. Напрыклад, беларускі сельскагаспадарчы тэрмін *парода* адначасова выступае і як геалагічнае найменне. У балгарскай мове прыведзеная лексема *(порода)* выступае толькі як тэрмін жывёлагадоўлі, а для абазначэння геалагічнага наймення тут выкарыстоўваецца словазлучэнне *изкопаема руда.* Найменне *пасадка* ўжываецца ў беларускай мове не толькі для абазначэння спецыяльнага сельскагаспадарчага дзеяння, але і са значэннем «упусканне пасажыраў у вагон, на самалёт, карабель і пад., каб яны маглі заняць месцы на час паездкі» [3, с. 68]. У балгарскай жа мове ў першым выпадку ўжываюцца сінанімічныя найменні *садене, посаджане,* а калі размова вядзецца пра пасадку на транспарт, выкарыстоўваецца найменне *качване.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Часам у сферы фіксацыі адна намінацыя выкарыстоўваецца і для абазначэння спецыяльнага паняцця, і для называння агульнаўжывальнага (ці нават размоўнага) паняцця. Так, лексема *пойла* служыць у беларускай сельскагаспадарчай тэрміналогіі для абазначэння піцця для жывёлы, а ў паўсядзённым жыцці тая ж самая намінацыя выкарыстоўваецца як назва напітку, непрыемнага на смак. У мове балгар у якасці спецыяльнага наймення ў гэтым выпадку выкарыстоўваецца тэрмін *течна храна,* а як размоўная – лексема *буламач.*

Такім чынам, фактычны матэрыял сферы фіксацыі пераконвае нас у тым, што полісемічныя намінацыі сельскагаспадарчай галіны вытворчасці шырока распаўсюджаны ў беларускай мове. А гэта абвяргае тэорыю пра тое, што тэрміналагічнасць як семантычная з'ява супрацьпастаўлена па сваіх уласцівасцях полісемі. Балгарскія лексемы не схільныя пераарыентоўваць унутраны змест паняццяў, але гэта не азначае, што яны поўнасцю адпавядаюць тым стандартным патрабаванням, што прад'яўляюцца да «ідэальных» тэрмінаў. Для сельскагаспадарчых лексем балгарскай мовы ў большай ступені, чым для іх беларускамоўных адпаведнікаў, характэрна наяўнасць сінонімаў для называння аднаго паняцця, што таксама не ўхваляецца спецыялістамі, паколькі ўскладняе камунікацыю.

Літаратура

1. Лотте, Д. С. Основы построения научно-технической терминологии : вопросы теории и методики / Д. С. Лотте; АН СССР, Комитет технической терминологии. – Москва : Изд-во АН СССР, 1961. – 158 с.
2. Рагаўцоў, В. І. Метады даследавання мовы : вучэбна-метадычныя матэрыялы : у 2 ч. / В. І. Рагаўцоў. – Магілёў : УА "МДУ імя А. А. Куляшова", 2011. – Ч. 1. – 108 с.
3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа ; пад агульн. рэд. К. К. Атраховіча (К. Крапівы). – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1977–1984. – Т. 4 : П–Р. – 1980. – 767 с.
4. Чукалов, С. К. Русско-болгарский словарь / С. К. Чукалов. – 7-е изд., стер. – Москва : Рус. яз., 1986. – 911 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова